ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
9 08 2018 г.

Рух ад сэрца

# «МАЯ ШКОЛА» — УРОКІ ДАБРЫНІ

**Бяром некалькі студэнтаў, прыбаўляем шчырае жаданне дапамагчы іншым, памнажаем на ініцыятыву і добры настрой і атрымліваем сотні дзіцячых усмешак! Вось такую незвычайную матэматыку можна вывучыць у «Маёй школе» — дабрачынным валанцёрскім праекце БДУ.**

Ідэя яго стварэння з'явілася ў 2012 годзе ў Ксеніі Воўк, цяпер ужо выпускніцы факультэта міжнародных адносін БДУ. Валанцёры працуюць у розных кірунках: дапамагаюць выхаванцам дзіцячых дамоў выканаць дамашнія заданні і навярстаць школьную праграму, далучаюць дзетак да спорту і арганізоўваюць матчы па футболе, праводзяць для малых забаўляльныя мерапрыемствы з гульнямі, тэатральнымі пастаноўкамі і падарункамі.

За гэтым заняткам і падурэць можна!

Сёння ў скарбонцы «Маёй школы» ўжо некалькі буйных акцый. Напрыклад, у 2015 годзе валанцёры арганізавалі фотапраект «Сонечная прафесія», які быў накіраваны на падтрымку дзяцей з сіндромам Даўна. Кожнае «сонечнае» дзіця расказала, кім хоча стаць, калі вырасце, а затым яго фатаграфавалі ў вобразе будучай прафесіі: маленькія футбалісты, пчаляры, мастакі — каго дзеці толькі не выбіралі! Прэзентацыя здымкаў адбылася ў Міжнародны дзень чалавека з сіндромам Даўна.

Яшчэ адзін незвычайны праект пад назвай «Бумеранг дабра» студэнты ажыццявілі вясной мінулага года. Некалькі тыдняў валанцёры наведвалі дзіцячыя дамы Мінска і праводзілі майстар-класы па вырабе брошак у выглядзе жывёл. Дзве брошкі дзеці пакідалі сабе, а іншыя дзве адпраўляліся ў гандлёвы цэнтр «Galleria Minsk». У ім можна было купіць корм і медыкаменты, неабходныя прытулкам для жывёл, і аддаць іх валанцёрам. У падарунак неабыякавыя людзі атрымлівалі самаробныя брошкі і паштоўкі з падзякай ад дзетак.

Сёння кіраўнік праекта «Мая школа» — Караліна Чарнашэй, сёлетняя выпускніца факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. «Быць валанцёрам — не так проста, — прызнаецца дзяўчына. — Недастаткова адзін раз наведаць дзіцячы дом і лічыць, што ты зрабіў вялікую справу. Каб падрыхтаваць нейкую акцыю, трэба патраціць шмат часу і сіл: мы праводзім сходы, на якіх абмяркоўваем ідэі для будучага мерапрыемства, думаем над іх увасабленнем, звязваемся са спонсарамі, прыцягваем СМІ. Гэта складаная і сур'ёзная работа».

Майстар-клас па вырабе брошак у дзіцячым доме № 5.

Па словах Караліны, для праекта патрэбны крэатыўныя людзі з вялікім запасам ідэй. Бо цяпер звычайнымі песнямі і казкамі дзяцей не здзівіш. Канешне, важна быць адкрытым, ветлівым, прыязным. Але самая галоўная якасць валанцёра — адказнасць. «Неабходна ўсведамляць усю сур'ёзнасць таго, чым ты займаешся. Дзеці бяруць прыклад амаль з кожнага, хто да іх прыходзіць. А значыць, валанцёр павінен паводзіць сябе правільна. Толькі чалавек, які адказвае за свае ўчынкі, здольны працаваць з дзецьмі», — сцвярджае кіраўнік праекта.

Дзяўчына таксама паведаміла, што выхаванцы дзіцячых дамоў вельмі не любяць, калі іх шкадуюць, яны крыўдзяцца, хоць і не заўсёды гэта паказваюць. Важна размаўляць з імі, як са звычайнымі дзецьмі і нават як з аднагодкамі, нягледзячы на тое, што яны маленькія. Варта не шкадаваць, а падумаць, як можна дзеткам дапамагчы: пагаварыць, развесяліць, прывезці цацкі або прысмакі.

Работа з дзецьмі прыносіць мора пазітыву і станоўчых эмоцый. А яшчэ ў вас з'явіцца шмат маленькіх шчырых сяброў. Напрыклад, у Караліны ёсць верная сяброўка Марына. Дзяўчаты часта размаўляюць па тэлефоне пра ўсё на свеце, школьніца заўсёды чакае Караліну ў госці.

Сваімі ўражаннямі падзялілася і валанцёр Карына Кантар, выпускніца біялагічнага факультэта БДУ. Дзяўчына дапамагае дзецям выконваць дамашнія заданні: «Летась я займалася з Анечкай, яна вучылася ў пачатковай школе. Калі мы толькі пазнаёміліся, чытаць дзяўчынка не ўмела. Анечка спрабавала схітрыць: прасіла мяне нешта прачытаць і на слых запамінала тэкст, а затым быццам бы чытала яго сама. Канешне, я адразу раскрыла яе сакрэт і змяніла тактыку. Цяпер дзяўчынка выдатна чытае! А фенаменальная памяць таксама спатрэбілася: Анечка вучыць вершы і з задавальненнем мне іх расказвае».

Калі вы цвёрда вырашылі стаць членам дружнай каманды валанцёраў, трэба толькі напісаць Караліне або іншым удзельнікам праекта ў сацыяльных сетках. Запрашаем усіх на ўрокі дабрыні ў «Маёй школе»!

**Ганна ЯЎСЕЙЧЫК,**
**студэнтка III курса**
**факультэта**
**журналістыкі БДУ.**

Абітурыент-2018

# Новыя кваліфікацыі для рабочых рук

**У новым навучальным годзе на базе сталічных устаноў прафтэхадукацыі распачнецца падрыхтоўка па дзевяці новых для горада кваліфікацыях.**

Так, Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж чыгуначнага транспарту будзе рыхтаваць памочнікаў машыніста электрацягніка. Каледж дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — кавалёў ручнога кавання і абліцоўшчыкаў сінтэтычнымі матэрыяламі. Каледж мантажных і пад'ёмна-транспартных работ — слесараў-электрыкаў па рамонце электраабсталявання і зборцы металаканструкцый. У прафесійна-тэхнічным каледжы лёгкай прамысловасці і бытавога абслугоўвання насельніцтва з'явіцца спецыяльнасць «прыёмшчык заказаў (цырульніцкія паслугі)», у механіка-тэхналагічным каледжы — «кулінар мучных вырабаў», прафесійным ліцэі № 9 аўтамабілебудавання — «маляр (па метале)». Каледж будаўнікоў, ліцэі № 7 і № 12 будаўніцтва вядуць набор на спецыяльнасць «мантажнік каркасна-абшывачных канструкцый сухога будаўніцтва». Гэтая прафесія — новая не толькі для горада, але і для краіны.

Новыя спецыяльнасці з'явяцца і ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У Мінскім дзяржаўным каледжы сферы абслугоўвання распачнецца падрыхтоўка па спецыяльнасці «сацыяльная работа», а ў Мінскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя М. А. Кедышкі — па спецыяльнасці «візуальны мерчандайзінг».

Прыём дакументаў на дзённую форму навучання будзе весціся ва ўстановах прафтэхадукацыі да 20 жніўня. Калі да канца гэтага тэрміну не ўсе планавыя месцы будуць запоўненыя, установа адукацыі па ўзгадненні з заснавальнікам можа падоўжыць тэрмін прыёму дакументаў да поўнага ўкамплектавання груп, але не пазней чым да 15 верасня бягучага года.

Ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі прыём дакументаў на аснове агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі завяршаецца 9 жніўня, на платную форму навучання — 16 жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Карысны досвед

# Як стаць найлепшым?

**Увесну прайшоў заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па 17 прадметах, у якой прынялі ўдзел 1460 вучняў з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны. Дыпломамі было ўзнагароджана 87 чалавек, лідзіравалі ў камандным заліку школьнікі з Мінска, а таксама з Гродзенскай і Гомельскай абласцей. Быць найлепшым не так проста: для гэтага вучні прыкладаюць вялікія намаганні. У кожнага героя — свая гісторыя...**

Анастасія Слуцкер атрымала дыплом першай ступені на алімпіядзе па грамадазнаўстве. Яна выпускніца 10 класа сталічнай гімназіі № 8.

— Грамадазнаўства першапачаткова было ў спісе прадметаў, якія мне падабаліся і якія трэба здаваць пры паступленні, але калі б не настаўнік, то я наўрад ці дайшла б да алімпіяды. Самае складанае — прымусіць сябе чытаць і вучыць. Але нежаданне кагосьці падвесці давала мне матывацыю, — расказвае Анастасія. — Калі даведалася пра курсы перад рэспубліканскай алімпіядай, паставілася да іх вельмі скептычна, але ў канцы алімпіяды маё меркаванне змянілася. А галоўны «ўдар» пры падрыхтоўцы прыйшоўся на канікулы, калі даводзілася ахвяраваць асабістым часам.

Аляксандра Маляўка з Гродна скончыла 11 клас ліцэя № 1, яна дасягнула вышынь у вывучэнні «навукі зорак» — астраноміі. Двойчы заваявала дыплом першай ступені на рэспубліканскай алімпіядзе, сёлета стала абсалютным пераможцам. Мае пахвальны водгук IOAA-2017 (міжнароднай алімпіяды па астраноміі і астрафізіцы), дыплом другой ступені Санкт-Пецярбургскай астранамічнай алімпіяды.

— Шчыра прызнацца, у самым пачатку думкі аб удзеле ў рэспубліканскай і тым больш міжнароднай алімпіядзе здаваліся далёкімі ад рэальнасці, больш захапляў сам працэс вывучэння прадмета. Ці цяжка давалася падрыхтоўка? Ёсць колькасць укладзеных сіл і часу, плюс твая зацікаўленасць у выніку, — расказвае Аляксандра. — Зразумела, нельга адмаўляць наяўнасць схільнасці да пэўнага роду дзейнасці, калі адчуваеш сябе «на сваім месцы». Думаю, астраномія і стала тым заняткам, дзе мне ўдалося адчуць, што я іду ў правільным кірунку і раблю гэта ў добрай кампаніі. Калі моцна захацець і правільна арганізаваць свой час, можна сумясціць практычна ўсё. Нават рашыць дзвесце задач, паралельна выканаць пяць практычных работ і вывучыць на памяць верш (усё да заўтрашняй раніцы). Але, нагружаючы мозг, нельга забываць і аб целе, фізічных нагрузках — цяпер я займаюся ў трэнажорнай зале.

Ганна Волкава — выпускніца 10 класа сталічнай гімназіі № 21. Поспехаў дзяўчына дабілася ў вывучэнні беларускай мовы і літаратуры, узяўшы дыплом першай ступені на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды.

## Знайсці матывацыю. Нават на канікулах

— Насамрэч, я заўсёды разумела, што мяне цікавіць вывучэнне моў, літаратуры і гісторыі, таму, канешне, і маю поспехі менавіта па гэтых школьных прадметах. Нельга, зразумела, не адзначыць вялікую падтрымку з боку маёй настаўніцы беларускай мовы і літаратуры, яе педагагічны талент, прагу да сваёй працы і ўменне ўбачыць патэнцыял у сваіх навучэнцаў. А два месяцы рэспубліканскіх збораў далі мне той пласт ведаў, якія ніколі не атрымаць на звычайных занятках у школе, — дзеліцца Ганна. — Што датычыцца матывацыі: яе трэба шукаць толькі ўнутры сябе самога. Калі ты сапраўды нечага жадаеш, то ўсё зробіш так, як трэба. Два месяцы перад алімпіядай я размаўляла толькі на беларускай мове. Бацькі падтрымліваюць мяне ў любым пачынанні, за што ім вялікі дзякуй.

Але ж алімпіяда — гэта не толькі адукаванасць і падрыхтоўка вучняў: важную ролю адыгрывае настаўнік. Ён і закладвае веды ў галовы маладых талентаў, прывівае любоў да прадмета.

Настаўнік геаграфіі сталічнай гімназіі № 8 Іван Васілевіч Булва, які сам у 2003—2005 гадах быў абсалютным пераможцам рэспубліканскіх алімпіяд па геаграфіі, раіць «зялёным алімпіяднікам»: «Не губляйце час нават летам. Самападрыхтоўка дапаможа менш напружвацца падчас наступнага навучальнага года. Зазірайце ў падручнікі за старшыя класы. Таксама падтрымлівайце стасункі са старэйшымі таварышамі-алімпіяднікамі — яны дапамогуць не толькі добрай парадай, але і патрэбнай літаратурай. Абавязкова знайдзіце курсы па вашым прадмеце, якія на міжшкольным узроўні праводзяць выкладчыкі з універсітэтаў».

**Анастасія СУРЫНАВА,**
**выпускніца 10 класа гімназіі № 8 г. Мінска.**